

**Алесь СУША, намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі:**

— Мне з настаўнікамі вельмі пашанцавала. На працягу ўсяго жыцця таленавітыя, адораныя людзі дапамагалі мне рухацца ў правільным напрамку. Першая настаўніца навучыла мяне любіць вучобу. Яна шмат часу прысвячала таму, каб мы, малыя, адаптаваліся да школы, каб пераход ад гульнявой да вучэбнай дзейнасці не стаў для нас стрэсам. У яе гэта атрымалася шыкоўна. Мы з задавальненнем хадзілі ў школу і не баяліся вучобы, не пужаліся складаных тэм — ні тады, ні потым. Ішлі ў школу, як на свята.

Другая настаўніца навучыла мяне верыць у сябе, усяліла ўпэўненасць у сваіх сілах. У 2 класе я перайшоў у іншую школу, да новага педагога. Я трапіў у моцны клас, дзе адставаў у чытанні і пісьме. Настаўніца падтрымала мяне. Яна не давала мне паслаблення, не стала менш патрабавальнай да мяне, але паказала, як справіцца з гэтай сітуацыяй, як дасягнуць поспеху. Хутка я дагнаў у вучобе астатніх. Але галоўнае — назаўсёды зразумеў, што ўсяго можна дасягнуць, калі прыкладаць намаганні.

У перыяд навучання ў гуманітарным ліцэі і ўніверсітэце педагогі далі мне новы навык — вучыцца заўсёды і ў кожнага. Нам выкладалі выбітныя асобы: супрацоўнікі НАН Беларусі, вучоныя, пісьменнікі, перакладчыкі, выкладчыкі УВА. Кожны быў лепшым у сваёй сферы спецыялістам-практыкам. Яны дапамаглі зразумець важную рэч: побач з табой мноства прафесіяналаў, кампетэнтных носьбітаў розных ведаў, якія могуць многаму цябе навучыць. Але ты павінен сам гэтыя веды ўзяць, а не чакаць, што табе іх дадуць. Ты сам мусіш быць зацікаўлены ў тым, каб даведацца новае ад гэтага чалавека, быць актыўным у камунікацыі. Падсумоўваючы, скажу, што, менавіта дзякуючы настаўнікам, я сфарміраваўся як асоба і прафесіянал.